паэзія

## Міхась Скобла



…памахае на расстаньне крыжам,
на дыбачкі прыўзьняўшыся, царква....

# Хрысьціянства

### СЬВЕТ ГЭТКІ ГАЛАВАКРУЖНЫ!

У чалавецтва кружыцца галава
ад эверэстаў, парнасаў, п’едэсталаў,
малакроўя, полькі беларускай, каханьня,
ніцшэ, дыму айчыны, $C_2O$…
І чалавецтва зьбіваецца з тропу,
губляе арыенціры,
роспачна азіраецца навокал,
ловіць у ветразі ружу вятроў,
хапаецца за звыклыя восі $x$ і $y$,
тузаецца ў трохмернай прасторы, —
дарэмна: сьвет стае лабірынтам.

І толькі сістэма каардынат Крыжа
вяртае людзей на сваё месца.

## ХОР СЬЛЯПЫХ У СТРОЧЫЦКАЙ ЦАРКВЕ

Драўляная царква. Рыпіць падлога.
Капеж заплесьці косы не пасьпеў,
а ўжо схіліўся купал
вухам Бога,
каб слухаць сьпеў.

І сум анёлаў на высокім нефе,
і сьвечак плач, і ваяўнічы шал
сьвятога Юр’я, што ў заўсёдным гневе
пранізваў цмока дзідай напавал,

і шашаль, што пашаткаваў паўшула,
і вецер, што за вокнамі пашумваў,
і павукі, што ткалі ад Каляд
сістэму ўласную каардынат, —

усё ўвасобілася ў слых, і шар да лузы
не дакаціўся ў блізкае карчме,
вушастае нашэсьце кукурузы
стаяла за царквой сабе наўме.

Нябачная айчына, прытаіся,
нябачных слухачоў прымі, парог,
нячутна з высяў горніх апусьціся
паслухаць хор сьляпых, нябачны Бог.

Вы ценямі, Забэйда і Каруза,
прыйдзіце ў цішыні нязвыклай схоў,
дзе залатыя зубы кукурузы
блішчаць з-пад асяледцаў кіяхоў…

А потым, стаўшы за пагоркам рыжым
на подыюм травы, і раз, і два
*ім* памахае на расстаньне крыжам,
на дыбачкі прыўзьняўшыся, царква.

* * *

Нябёсаў выпераны шэры ток
у лістападнай стыне пазалоце.

Сабака рыжы,
як электраток,
ахвочы сноўдаць па напятым дроце.

Час разьвітаньня і спакою час.
Глядзіш навокал і вачэй ня зводзіш.
Плот. Агарод. На падваконьні прас.
І як тунэль у ЗША – калодзеж.

Вісяць начоўкі чоўнам без вясла,
паточаныя на сьцяне іржою,
і дзічка, што ў падмурак урасла,
усё – як патойбочнае, чужое.

І ўсё ж вяртацца хочацца сюды
і доўга слухаць на падворку хаты
далёкі ўсьплёск калодзежнай вады
і рэха, што не эмігруе ў Штаты.

## NOTA BENE

Не забыцца падаіць парэчкі;
калодзежным вочапам
пагрукаць у падлогу
дзесьці ў Кліўлендзе ці ля Атавы:
sorry, спадары антыподы,
давайце знаёміцца;
папрасіць гладыёлусы:
не падпальвайце хату;
з выспы нявыспанай птаха
узняць напаўголасу;
завастрыць касьцёл, як аловак,
нашча
прымружаным позіркам;
вярнуцца і ў кошык бульбіны-яйкі сабраць
з-пад клубняў-квактухаў,
каб не заседзелі;
а пад вечар
выстругаць такое стырно
для Харонавага чоўна,
каб ён плыў бумерангам!

Не забыцца…

**БІЛЬЯРД**

Штовечар шар сонца
пасьля ўдару нябачнага кія
коціцца па небе й цікуе:

ці пасьпее наставіць зямля
лузу вулкана.